Малітва ў інтэнцыі і сінода гродзенскай дыяцэзіі

Аўтар: Рэдакцыя
12.11.2017 00:00



Згодна з пастановай кс. біскупа Аляксандра Кашкевіча, у кожную нядзелю пасля св. Імшы вернікі парафій дыяцэзіі будуць прамаўляць спецыяльную малітву ў інтэнцыі сінода.

Божа Адзіны ў Святой Тройцы,
з’яднаныя ў супольнасці гродзенскага Касцёла,
мы хочам разам вырушыць у дарогу,
каб добра падрыхтаваць і плённа пражыць першы дыяцэзіяльны сінод.

Просім Цябе, Ойча, поўны міласэрнасці,
напоўні нас сваёй праўдай, любоўю і супакоем,
каб мы верна здзяйснялі Твой план збаўлення
чалавецтва, былі адкрытыя на дар актыўнага
супрацоўніцтва ўсіх вернікаў дыяцэзіі. †

Просім Цябе, Езу, Сын Жывога Бога,
каб мы заўсёды з вялікай пакорай і даверам распазнавалі знакі часу ў святле Евангелля,
будуючы супольнасць нашай дыяцэзіі па Тваім вобразе.

Заклікаем Цябе, Святы Дух Жыватворца,
каб мы, напоўненыя Тваімі дарамі,
аднавілі і ажывілі супольнасць гродзенскага Касцёла
ў еднасці з Паўсюдным Касцёлам.

Марыя, Маці Міласэрнасці,
Апякунка Гродзенскай дыяцэзіі, вядзі нас
і падтрымлівай у сінадальнай пілігрымцы веры!
Святы Казімір, маліся за нас!

Святы Максімільян, маліся за нас!
Бласлаўлёныя сёстры мучаніцы з Навагрудка,
маліцеся за нас!
Бласлаўлёны Генрых Глябовіч, маліся за нас!
Бласлаўлёная Мар'яна Бярнацкая, маліся за нас!

Праграма адкрыцця сінода

10.00 – канферэнцыя на тэму "Роля і выклікі дыяцэзіяльнага сінода для гродзенскага Касцёла" (могуць прыняць удзел як духоўныя асобы, так і свецкія);

11.00 – адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту;

12.00 – урачыстая св. Імша на распачацце сінода (прымуць удзел біскупы, а таксама першы сакратар Апостальскай Нунцыятуры ў Беларусі мансеньёр Марынка Антолавіч).